

Што думаюць дэпутаты аб правах чалавека ў Беларусі?

СТАР. 3



Жыццё ў камуне: як магчымасці страчваюць межы?

СТАР. 4



«Хуткая дапамога» для вусатага сябра

СТАР. 5

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 СНЕЖНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 232 (27597) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## У РАБОЦЕ З КІРУЮЧЫМІ КАДРАМІ ПАТРЭБНА СІСТЭМА

**Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў 9 снежня, прымаючы з дакладам прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча, кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэя Кабякова і старшыню Камітэта дзяржкантролю Аляксандра Якабсона, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Асноўнай тэмай сустрэчы стала падрыхтоўка да правядзення 10 снежня рэспубліканскай нарады па вырашэнні праблемных пытанняў у будаўнічай галіне і ўдасканаленні работы з кіруючымі кадрамі.

«На жаль, на вышэйшым узроўні мы не выпрацавалі сістэму работы з кіруючымі кадрамі, і ўсё атрымліваецца наскокам і ад выпадку да выпадку. Добра, што актуальныя пытанні выносім на разгляд. Я гэта гавару таму, што такая сістэма павінна быць выпрацавана, — сказаў Прэзідэнт. — Мы да гэтага пытання ў свой час падыходзілі і быццам бы нешта там намацалі. Таму нам трэба тут вызначыцца. Мінімум раз у паўгоддзе мы павінны праводзіць такія мерапрыемствы».

«Мы павінны на ўзроўні Прэзідэнта праводзіць гэтыя мерапрыемствы з нашым актывам, каб арыентаваць людзей на вырашэнне важнейшых задач, якія стаяць перад грамадствам. Першае пытанне — гэта сістэма. Сістэмы гэтай пакуль няма», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Звяртаючыся да прэм'ер-міністра, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што прапановы рабочай групы па вырашэнні праблемных пытанняў у будаўніцтве павінны быць прааналізаваны і вывучаны ва ўрадзе. «Якім бы ні быў вялікі Кабякоў і тыя, каго ён сабраў (работа праведзена вялікая і, напэўна, эфектыўная), усё ж такі вам трэба прымаць рашэнне. У новы год мы павінны выйсці з новым будаўнічым комплексам, а там куча прапаноў па нарматворчасці, і ўжо сёння трэба гэтыя рашэнні прыняць. Але самае галоўнае — паглядзець, якія рашэнні і рэкамендацыі групы трэба падтрымаць, а якія — не. А, магчыма, і ў цэлым. Я тут нічога не абвяргаю. Таму рана сёння Прэзідэнту выступаць на галоўнай падзеі года і хваліць нейкую групу», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Нарада пройдзе, мы абазначым праблемы, але з 1 студзеня 2014 года мы гэтыя праблемы павінны вырашаць. І не дай бог у будаўнічым комплексе, ды і па іншых напрамках (будаўніцтва — гэта навука для іншых) з'явяцца такія ж недахопы, якія мы назіралі і ў гэтым, і мінулыя гады», — папярэдзіў беларускі лідар.

«Трэба вярнуць ліцэнзаванне — вяртайце. Трэба ўзмацніць кантроль — узмацняйце. Але расхлябанасці ў рабоце з насельніцтвам не павінна быць. Асабліва там, дзе арганізацыі маюць справу з грашыма людзей. Узялі ў людзей грошы, паабяцалі ў гэты тэрмін увесці за гэту цану — уводзьце, і з добрай якасцю. Не — поўнасцю кампенсацыя, нават у двухкратным памеры, каб людзі на нас не крыўдзіліся. Дапусцілі правапарушэнне — у турму», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

## МАДЭРНІЗАЦЫЯ — ПАСТАЯННЫ ПРАЦЭС

**Пытанні правядзення комплекснай мадэрнізацыі эканомікі Беларусі, а таксама работы малога і сярэдняга бізнесу знаходзіліся ў цэнтры ўвагі ў час даклада Аляксандру Лукашэнку 9 снежня намесніка прэм'ер-міністра Пятра Пракаповіча, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што мадэрнізацыя, інакш кажучы, удасканаленне вытворчасці, — гэта пастаянны працэс. «Калі мы стварылі нават новае прадпрыемства сёння, то заўтра ўжо трэба яго ўдасканальваць, у адваротным выпадку адстанем. Я гавару гэта не ў апраўданне на тую крытыку, якая гучыць з боку некаторых нашых апанентаў, што вось несвоечасова мадэрнізацыю пачалі, што гэта вялікія грошы і гэтак далей. Нельга так ставіць пытанне: своечасова — несвоечасова. Кожны дзень трэба мадэрнізавацца, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — На ўсё трэба звяртаць увагу і ўдасканальваць, пачынаючы ад сябе і заканчваючы ўсім, што вакол цябе. Гэта не падлягае сумненню».

Прэзідэнт звярнуў увагу, што яго непакоіць іншы момант. «Хацелася б, каб вы развеялі маю насцярожанасць. Так, мы мадэрнізуем прадпрыемствы, каб атрымаць перш за ўсё добры экспартны прадукт, таму што экспарт — гэта адзін з нашых прыярытэтаў, патрэбна валюта, гэта вечнае наша пытанне, якое мы, напэўна, будзем вырашаць яшчэ доўга, як і падобныя да нас дзяржавы вырашаюць такія пытанні. Ці не атрымаецца так, што мы сёння мадэрнізуем, узялі замежныя крэдыты, закупілі добрае абсталяванне, атрымалі прадукт, а заўтра зноў завалім ім склады і не зможам прадаць?» — сказаў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

### АНОНС «ПРАМОЙ ЛІНІІ»

### УСЕ ПЫТАННІ ГРАШОВА-КРЭДЫТНАЙ ПАЛІТЫКІ

**18 снежня 2013 года з 11.00 да 12.00** у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Надзеі Андрэеўны ЕРМАКОВАЙ**. Калі вас хвалююць пытанні стабільнасці курсу беларускага рубля, захавання ўласных зберажэнняў, працэнтаў па ўкладах і крэдытах і любыя іншыя аспекты грашова-крэдытнай палітыкі нашай краіны, — тэлефануйце!

Задаваць пытанні падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефонах **8 (017) 287 18 66 і 8 (017) 287 18 71**. Папярэднія пытанні дасылайце на электронны адрас рэдакцыі **info@zvyazda.minsk.by**.

# І зіма не бяда — лечаць снег і вада!



**Цяперашні сезон брэсцкія «маржы», па традыцыі, адкрылі з першым снегам. На беразе ракі Мухавец 8 снежня сабраліся аматары зімовага купання. І хоць не было традыцыйнай палонкі, бо вада яшчэ не замерзла, купанне з абавязковым расціраннем снегам адбылося.**

Фота БЕЛТА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ЛАДУЦЬКА, старшыня Мінскага гарвыканкама:**

***«На рынку гасцінічных паслуг у навагоднія і калядныя святы ўсплёску цэн быць не павінна. Усе санаторыі, прафілакторыі пад Мінскам выкупленыя — гэта маса людзей, яны павінны атрымаць набор усіх паслуг — культурных, спартыўных, забаўляльных, гандлёвых. Гаворка ідзе пра мільёны долараў. Адказныя кіраўнікі структурных падраздзяленняў выканкама павінны адпрацаваць усе пытанні па якасці паслуг гасцінічнага комплексу. Неабходна таксама ведаць, як рэагуе рынак прыватных гасцінічных паслуг, у тым ліку кватэр на суткі, ці не рэзка там павялічаны цэны. Мы павінны валодаць усёй сітуацыяй».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.12.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9400,00 | ■ |
| Еўра | 12880,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 287,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1148,44 | ▲ |

■ Сталічнае будаўніцтва

## ПАД ПІЛЬНЫМ КАНТРОЛЕМ УЛАД

**Сёлета ў сталіцы за ліпень—лістапад уведзена ў эксплуатацыю 35 жылых дамоў і 2 пускавыя комплексы са звышнарматыўным тэрмінам будаўніцтва, паведаміў выконваючы абавязкі старшыні камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Аляксандр СЦЯПАНАЎ на пасяджэнні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.**

Паводле інфармацыі прэсслужбы Мінгарвыканкама, па стане на канец лістапада на тэрыторыі Мінска з улікам новых аб'ектаў у стадыі будаўніцтва знаходзяцца 42 жылыя дамы са звышнарматыўнымі тэрмінамі будаўніцтва (у іх ліку і пяць праблемных аб'ектаў). Па 18 аб'ектах заказчыкамі выступаюць УКБ раёнаў і аб'яднанне «Мінскбуд». Астатнія ўзводзяць прыватныя забудоўшчыкі. Сярод праблемных дамоў ажно 30 аб'ектаў узводзіцца па лініі долевага будаўніцтва. Арганізацыямі-заказчыкамі па гэтых дамах былі распрацаваны графікі ажыццяўлення работ з завяршэннем будаўніцтва ў 2013—2014 гады. Дакументы аб гэтым былі зацверджаны на пасяджэннях раённых адміністрацый, на якіх арганізацыі-заказчыкі і падрадныя арганізацыі папярэджаны аб адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці ў рамках дзеючага заканадаўства за зрыў тэрмінаў уводу аб'ектаў у эксплуатацыю.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Штотыдзень ажыццяўляецца аб'езд «праблемных» дамоў з удзелам намесніка старшыні Мінгарвыканкама, а таксама прадстаўнікоў камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама, адміністрацый раёнаў, кіраўнікоў арганізацый заказчыкаў і генпадрадчыкам, па выніках якіх даюцца адпаведныя даручэнні.

СТАР. 2

■ Сустрэлі сцюжу

## З ПЕРШЫМ «ПАДАРУНКАМ» СНЕЖНЯ!

**За мінулыя суткі з мінскіх вуліц вывезлі амаль 7 тысяч кубаметраў снегу.**

Другога «Хаўера», на шчасце, не здарылася. Тым не менш, белыя гурбы на дахах, тратуарах і машынах прымусілі хуценька ўзяцца за працу, каб расчысціць «прастору для жыцця». Як паведаміў журналісту «Звязды» **намеснік генеральнага дырэктара па бягучым утрыманні дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Гаррамаўтадар» Мінгарвыканкама» Анатоль ЖАМОЗДЗІК,** гарадскія вуліцы ратавалі ад стыхіі з дапамогай 600 адзінак спецыялізаванай тэхнікі, а на прыбіранні прыпынкаў грамадскага транспарту, перакрыжаванняў, пешаходных пераходаў, мастоў і пуцеправодаў працавала больш за 700 чалавек. Для барацьбы з галалёдам было выкарыстана 500 тон солі і 650 кубаметраў пясчана-салявой сумесі.

Прыбраць снег спяшаюцца і са сталічных дахаў. Па інфармацыі дзяжаб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка», у першую чаргу расчышчаюць снег на стрэхах тых дамоў, якія размешчаны ўздоўж асноўных магістраляў сталіцы. У гэтай справе вельмі дапамагаюць аўтавышкі. Такая небяспечная праява гарадской зімы, як ледзяшы, на шчасце, сёлета яшчэ не паспела стаць праблемай. Як паведамляюць у дзяржаб'яднанні, вялікай колькасці ледзяшоў на дахах пакуль не заўважана, таму пазбаўляцца ад іх няма неабходнасці.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### АЗБУКА БЯСПЕКІ

## ДАВАЙЦЕ НЕ БУДЗЕМ РАДАВАЦЬ БЛЯХАРА!

**За мінулыя выхадныя на дарогах краіны было зарэгістравана 479 дарожна-транспартных здарэнняў з матэрыяльнай шкодай.**

Дзяржаўтаінспекцыя заклікае кіроўцаў быць уважлівымі і асцярожнымі за рулём у складаных умовах надвор'я і пра складаных дарожных умовах. Падчас моцных ападкаў трэба рухацца з уключаным бліжнім святлом фар, выбіраць бяспечную хуткасць і дыстанцыю, з асаблівай асцярожнасцю рухацца па мастах, эстакадах, паблізу пешаходных пераходаў, адмовіцца ад рэзкіх тармажэнняў і манеўраў.

Кіроўцы, захоўвайце правіла паркоўкі і не пакідайце аўтамабілі на краі праезнай часткі, каб не перашкаджаць нармальнаму руху транспарту і працы снегаўборачнай тэхнікі.

У ДАІ нагадваюць, што ачышчаная і апрацаваная процігалалёдным саставам дарога не адразу робіцца бяспечнай. Патрабуецца час і пэўная інтэнсіўнасць руху транспартных сродкаў, каб сумесь пачала «працаваць» і выконваць свае функцыі. У гэтых умовах важна выбіраць бяспечную хуткасць.

Неабходна праяўляць асаблівую ўвагу пры з'яўленні на праезнай частцы пешаходаў. Цёплая верхняя вопратка робіць непаваротлівымі, шалікі і капюшоны абмяжоўваюць агляд, а дрэнная бачнасць і слізкая дарога перашкаджаюць людзям хутка адрэагаваць на небяспеку, калі тая ўзнікае.

Пешаходам таксама неабходна быць вельмі ўважлівымі. Пераходзіць дарогу — толькі ва ўстаноўленых месцах. Нават на рэгулюемых пешаходных пераходах не пачынаць пераход, пакуль усе аўтамабілі не спыняцца.

Дзяржаўтаінспекцыя нагадвае таксама, што веласіпедыстам і кіроўцам мапедаў, згодна з правіламі дарожнага руху, падчас снегападу і галалёдзіцы рухацца на двухколавым транспарце ўвогуле забаронена.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЯНУКОВІЧ ПАРАІЦЦА З ПАПЯРЭДНІКАМІ

Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч падтрымаў ідэю правесці агульнанацыянальны «круглы стол» з удзелам прадстаўнікоў улады і апазіцыі для пошуку кампрамісу ў краіне. Пра гэта ў панядзелак паведамляецца на сайце кіраўніка дзяржавы. З прапановай правесці «круглы стол» для вырашэння палітычнага крызісу 5 снежня выступілі тры былыя лідары Украіны — Леанід Краўчук, Леанід Кучма і Віктар Юшчанка. На аўторак 10 снежня ўжо запланавана сустрэча дзеючага і трох былых прэзідэнтаў для «абмеркавання найважнейшых пытанняў, якія стаяць перад краінай». Раней Краўчук, Кучма і Юшчанка выступілі з заявай, у якой падтрымалі пратэст апазіцыйных сіл супраць адмовы аб інтэграцыі Украіны з Еўрасаюзам. Дата правядзення агульнанацыянальнага «круглага стала» пакуль не называецца.

### ПУЦІН ЛІКВІДАВАЎ РІА «НАВІНЫ»

Прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін падпісаў указ аб ліквідацыі інфармацыйнага агенцтва РІА «Навіны». На яго базе будзе створана «Міжнароднае інфармацыйнае агенцтва «Расія сёння». Гендырэктарам новага агенцтва прызначаны вядучы тэлеканала «Расія 1» Дзмітрый Кісялёў. Згодна з указам, генеральны дырэктар «Расія сёння» прызначаецца і вызваляецца ад пасады прэзідэнтам. Як вынікае з апублікаванага Крамлём дакумента, асноўным кірункам дзейнасці новага агенцтва стане асвятленне за мяжой дзяржаўнай палітыкі Расійскай Федэрацыі і расійскага грамадскага жыцця. Акрамя таго, Пуцін рэарганізаваў «Российскую газету», далучыўшы да яе рэдакцыю часопіса «Родина».

ISSN 1990 - 763X

### КАМБІНЕЗОН БРУСА ЛІ ПАЙШОЎ З МАЛАТКА



У Ганконгу адбыўся аўкцыён, на якім з малатка пайшоў жоўты камбінезон легендарнага акцёра і майстра баявых мастацтваў Бруса Лі, паведамляе Bloomberg. Лот прынёс аўкцыённаму дому Spink China 650 тысяч ганконгскіх долараў (каля 83 тысяч долараў ЗША). Хто менавіта стаў пакупніком касцюма з фільма «Гульня смерці» 1972 года, не паведамляецца. Усяго ж на таргах было прадстаўлена чатырнаццаць лотаў, звязаных з іменем Бруса Лі. Сярод іх, напрыклад, нунчакі (450 тысяч ганконгскіх долараў), абутак для заняткаў кунг-фу (40 тысяч), бамбукавы кій (80 тысяч долараў) і іншыя прадметы. Таргі ў Ганконгу былі прысвечаны 40-й гадавіне з дня смерці Бруса Лі.

### У ЛІТВЕ НЕДАХОП РАБОЧАЙ СІЛЫ

Нягледзячы на тое, што ўзровень беспрацоўя ў Літве складае 11,9%, амаль 40% літоўскіх працадаўцаў, як заяўляе дырэктар Інстытута працы і сацыяльных даследаванняў Баляслаў Гружэўскіс, сутыкаюцца з недахопам кваліфікаванай рабочай сілы, паведамляюць інфармагенцтвы. Прэм'ер-міністр Літвы Альгірдас Буткявічус адзначае, што Літва павінна імкнуцца да прыцягнення спецыялістаў рознага профілю: ад кваліфікаваных рабочых, зваршчыкаў, токараў, мантажнікаў да высокакваліфікаваных інжынераў і менеджараў. Літоўская біржа працы ўжо зацвердзіла спіс прафесій, прадстаўнікоў якіх у Літве відавочна не хапае і якіх можна легальна ўвозіць з-за мяжы. Гэта зваршчыкі, швачкі, кухары рэстаранаў, кіроўцы-дальнабойшчыкі. У Еўрасаюзе 26% працадаўцаў скардзяцца на недахоп кваліфікаванай працоўнай сілы. Асабліва імкліва ў ЕС расце попыт на працоўную сілу ў сферы аховы здароўя.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### СПЕЦЫІ ДАПАМОГУЦЬ САРДЭЧНІКАМ І ДЫЯБЕТЫКАМ



Сучасная медыцына, як і нетрадыцыйная, прызнае карысць спецый. Да прыкладу, насенне каляндры багата на ліналаол і дзеканавую кіслату, піша Financial Express. Гэтыя злучэнні зніжаюць узровень «шкоднага халестэрыну» і цукру, павялічваючы канцэнтрацыю «карыснага халестэрыну». 1—2 чайныя лыжкі каляндры паказаны асобам з хваробамі сэрца і дыябетам.

Куркума карысная для сэрца з-за куркуміну. Гэта моцны антыаксідант, які зніжае рызыку ўтварэння тромбаў, запалення. А чорны перац змяшчае актыўнае злучэнне піперын, якое таксама зніжае халестэрын. Гэта дазваляе аднавіцца сэрцу пасля сардэчнага прыступу.

Карыца стымулюе кровазварот, пазітыўна адбіваецца на суадносінах «шкоднага» і «карыснага халестэрыну», паляпшае паказчыкі інсулінавай рэзістэнтнасці. Імбір расслабляе крывяносныя сасуды, стымулюе прыток крыві і аблягчае боль. Ён таксама здымае запаленне, якое нярэдка суправаджае дыябет, хваробы сэрца і рак. Яшчэ імбір разрэджвае кроў і зніжае халестэрын. Часнок таксама зніжае халестэрын, рызыку ўтварэння тромбаў і высокага ціску.

## МАДЭРНІЗАЦЫЯ — ПРАЦЭС ПАСТАЯННЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што мадэрнізацыя ажыццяўляецца дзеля таго, каб атрымаць больш дасканалы прадукт і ў канкурэнтнай барацьбе на міжнародных рынках яго рэалізаваць.

Кіраўнік дзяржавы абазначыў яшчэ адну тэму — развіццё малых і сярэдніх прадпрыемстваў, праблемныя пытанні іх функцыянавання, а таксама гатоўнасць бізнесу працаваць у малых гарадах, дзе для яго створаны льготныя ўмовы. Акрамя таго, Прэзідэнт запатрабаваў далажыць аб сітуацыі з дзяржаўнай маёмасцю, якая не выкарыстоўваецца, і яе далейшым уключэнні ў абарот.

Як адзначыў Пётр Пракаповіч, комплексная мадэрнізацыя беларускай эканомікі з'яўляецца галоўным напрамкам работы ўрада, таму што менавіта яна дае магчымасць павысіць прадукцыйнасць працы, вырашыць пытанні канкурэнтаздольнасці эканомікі. Праграма комплекснай мадэрнізацыі распрацавана на 2820 прадпрыемствах з дзяржаўнай доляй уласнасці, у тым ліку на 701 прадпрыемстве, дзе доля дзяржавы складае 50 працэнтаў і больш. Віцэ-прэм'ер са шкадаваннем заўважыў, што пакуль работа ідзе не так, як хацелася б. Ёсць частка прадпрыемстваў, дзе не пачалася тэхнічная, інвестыцыйная мадэрнізацыя, па розных прычынах, пачынаючы ад негатоўнасці дакументацыі і заканчваючы адсутнасцю тэндараў на закупку абсталявання.

Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што неабходна праводзіць не толькі тэхнічную мадэрнізацыю, але і эканамічную, якая дае не меншыя вынікі без матэрыяльных укладанняў. Маецца на ўвазе ўдасканаленне і ўкараненне самых сучасных сістэм кіравання, няўхільнае выкананне патрабаванняў і тэхналогій па якасці прадукцыі, зніжэнню сабекошту, матэрыялаёмістасці, энергаёмістасці.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў асаблівую ўвагу, што павінны быць максімальна выкарыстаны магчымасці, якія з'яўляюцца ў сувязі з мадэрнізацыяй дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў. На яго думку, у гэтым напрамку трэба стымуляваць малы і сярэдні бізнес, асабліва ў мэблевай галіне, каб нарасціць экспарт і задзейнічаць адходы дрэваапрацоўкі. Прэзідэнт даручыў вывучыць, што тармозіць развіццё малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, і далажыць яму.

# ПРАВАСУДДЗЕ Ў ІНТАРЭСАХ ЛЮДЗЕЙ

**Судова-прававая рэформа дасць магчымасць палепшыць якасць і аператыўнасць правасуддзя. Гэта адзначыў Аляксандр Лукашэнка 9 снежня на сустрэчы са старшынёй Вярхоўнага суда Валянцінам Сукалам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з рэфармаваннем судовай сістэмы.

«Усе рашэнні па стварэнні новай судовай сістэмы ў краіне прыняты, і з 1 студзеня 2014 года яна будзе дзейнічаць», — падкрэсліў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ў старшыні Вярхоўнага суда, як ідуць працэсы рэфармавання: «Ні ў якім выпадку нельга дапусціць якога-небудзь недастатковага разумення гэтых пытанняў. Хацелася б ведаць, што вас насцярожвае ў гэты момант. Мяне цікавіць настрой у Вярхоўным судзе і Вышэйшым гаспадарчым судзе.

Зразумела, што карпаратыўнасць судовай сістэмы высокая. Таму вельмі тонкая і акуратная павінна быць работа».

«Мы крытыкуем часта, ды і народ нас крытыкуе за судовую сістэму, работу суддзяў. Але мы ведаем, якія судовыя сістэмы вакол і як яны працуюць у іншых дзяржавах, я ўжо не гавару пра суседзяў, — наогул у свеце. Таму на нашу судовую сістэму можна маліцца», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Тым не менш людзі прад'яўляюць прэтэнзіі, і нам трэба больш акуратна падыходзіць да фарміравання новай судовай сістэмы. Самае галоўнае, каб мы не пакрыўдзілі суддзяў, якія будуць працаваць заўтра, і каб сітуацыя не пагоршылася», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Мы прынялі рашэнне, і гэтым шляхам павінны ісці. Яно выверанае і, галоўнае, адпавядае жыццёвым патрэбнасцям нашай дзяржавы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт яшчэ раз адзначыў, што асноўная сутнасць рэформы — паляпшэнне якасці правасуддзя, яго даступнасці, галоснасці, аператыўнасці, каб яно ажыццяўлялася ў інтарэсах людзей.

Валянцін Сукала расказаў, што вядзецца работа па асноўных арганізацыйных і кадравых напрамках судова-прававой рэформы. Паводле яго слоў, ідзе актыўнае рэфармаванне, а дакладней, стварэнне практычна новай сістэмы.

# ПРАВІЛЫ ВЯДЗЕННЯ ПАЛЯВАННЯ І РЫБАЛОЎСТВА ПА-НОВАМУ

**Правілы вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання і Правілы вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства ў Беларусі выдадзены ў новай рэдакцыі. Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта, Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ № 551, якім уносяцца змяненні і дапаўненні ва ўказы ад 8 снежня 2005 года № 580 «Аб некаторых мерах па павышэнні эфектыўнасці вядзення паляўнічай гаспадаркі і рыбагаспадарчай дзейнасці, удакладненні дзяржаўнага кіравання імі» і ад 26 красавіка 2010 года № 200 «Аб адміністрацыйных працэдурах, якія ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па заявах грамадзян».**

Згодна з гэтым указам выкладаюцца таксама ў новай рэдакцыі дадаткі да Дзяржаўнай праграмы развіцця паляўнічай гаспадаркі на 2006—2015 гады. Пры гэтым улічаны практыка прымянення дзеючых нормаў правілаў палявання і рыбалоўства, а таксама звароты грамадзян, прапановы дзяржаўных органаў, навуковых арганізацый, карыстальнікаў паляўнічых і арандатараў рыбалоўных угоддзяў.

У правілах прыменены адзіныя падыходы да вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання ўсімі карыстальнікамі паляўнічых угоддзяў незалежна ад ведамаснай падпарадкаванасці.

Вызначана, у якіх выпадках перадача ў арэнду паляўнічых угоддзяў праводзіцца без правядзення таргоў.

Па прапановах грамадскасці з правілаў палявання выключана паняцце «дзікія жывёлы непажаданых відаў».

Рэгуляванне распаўсюджвання і колькасці баклана і чаплі шэрай дазваляецца толькі на тэрыторыі рыбаводных арганізацый.

У мэтах спрашчэння працэдуры набыцця паляўнічымі паляўнічых пуцёвак прадугледжваецца іх рэалізацыя праз спецыялізаваную інфармацыйную сістэму ў сетцы інтэрнэт, якая распрацавана згодна з заданнем Мінлясгаса і цяпер праходзіць вытворчую апрабацыю і наладку.

Уведзены замацаваныя ў правілах палявання адміністрацыйныя працэдуры выдачы новага дзяржаўнага пасведчання на права палявання пасля заканчэння тэрміну дзеяння выдадзенага раней, выдачы дубліката дзяржаўнага пасведчання на права палявання, унясення змяненняў і дапаўненняў у дзяржаўнае пасведчанне на права палявання. Адначасова ўносіцца змяненне ў адміністрацыйную працэдуру выдачы дзяржаўнага пасведчання на права палявання, сутнасць якога ў абавязковасці праходжання падрыхтоўкі да спецыяльнага паляўнічага экзамену, што дасць магчымасць павысіць прававы, экалагічны, маральна-этычны ўзровень, стралковую падрыхтоўку паляўнічых-пачаткоўцаў.

Павялічаны памер платы да 0,5 базавай велічыні за рэгістрацыю паляўнічых сабак і 0,25 базавай велічыні за рэгістрацыю лоўчых птушак, падсадных і іншых дзікіх жывёл, якія выкарыстоўваюцца для палявання, муштроўкі, нагонкі і правядзення спаборніцтваў.

Павышаны ўзровень прыняцця рашэнняў аб прадастаўленні ў арэнду паляўнічых угоддзяў за кошт перадачы гэтых функцый ад раённых Саветаў дэпутатаў аблвыканкамам. Прадугледжана ўвядзенне механізму акрэдытацыі Мінлясгасам сумесна з Мінпрыроды, Дзяржаўнай інспекцыяй аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Беларусі і аблвыканкамамі юрыдычных асоб, якія арандуюць паляўнічыя ўгоддзі, у парадку, вызначаным Саветам Міністраў.

Выкладзены ў новай рэдакцыі азначэнні паняццяў «паляванне», «рыбалоўства», «незаконнае рыбалоўства».

У мэтах папярэджання фактаў незаконнага палявання будуць унесены адпаведныя дапаўненні ў Крымінальны кодэкс і Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях, якія прадугледжваюць санкцыі за набыццё, захоўванне, перамяшчэнне, перавозку (транспарціроўку), разбіранне і перапрацоўку незаконна здабытых дзікіх жывёл.

Указам прадугледжана павелічэнне ў сярэднім у 3 разы памеру таксаў, што прымяняюцца для вызначэння памеру кампенсацыі шкоды, прычыненай навакольнаму асяроддзю фізічнымі і юрыдычнымі асобамі ў выніку незаконнага здабывання або знішчэння дзікіх жывёл і шкоднага ўздзеяння на асяроддзе, якое яны насяляюць.

Пры паляванні на птушыных і пушных дзікіх жывёл паляўнічых відаў нашэнне патронаў, начыненых куляй і карцеччу, забаронена.

У мэтах аптымізацыі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства ўнесены наступныя змяненні і дапаўненні.

Са складу асноўных паняццяў і іх азначэнняў выключана паняцце «браканьерства», уведзена паняцце «незаконнае рыбалоўства». Азначэнне гэтага паняцця прыведзена ў адпаведнасць з Крымінальным кодэксам і Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях.

У адпаведнасці з Водным кодэксам уведзена паняцце «чацвёртая катэгорыя вадатокаў — працягласцю да 5 км». Вызначана, у якіх выпадках перадача ў арэнду рыбалоўных угоддзяў праводзіцца без таргоў.

У мэтах павышэння адказнасці арандатараў рыбалоўных угоддзяў за іх карыстанне ўстаноўлены тэрмін заключэння дагавора арэнды рыбалоўных угоддзяў не менш як дзесяць гадоў (па дзеючых правілах — пяць гадоў).

Правілы рыбалоўства дапоўнены палажэннем аб тым, што карыстальнік рыбалоўных угоддзяў адзін раз у пяць гадоў праходзіць акрэдытацыю на права вядзення рыбалоўнай гаспадаркі ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў. Акрэдытацыю ажыццяўляе Мінсельгасхарч сумесна з Мінпрыроды, Дзяржінспекцыяй і аблвыканкамамі.

У частцы прамысловага рыбалоўства правілы дапоўнены некалькімі ўмовамі. У прыватнасці, прамысловае рыбалоўства ажыццяўляецца юрыдычнымі асобамі ў фондзе запасу рыбалоўных угоддзяў па квотах, якія рэалізуюцца аблвыканкамамі ў парадку і на ўмовах, устаноўленых Саветам Міністраў.

У выпадку неасваення квот на вылаў рыбы арандатарам рыбалоўных угоддзяў на працягу аднаго года пасля заключэння дагавора арэнды гэтых угоддзяў квоты на вылаў рыбы на наступны год не ўстанаўліваюцца і дагавор арэнды падлягае скасаванню ва ўстаноўленым парадку.

Узмоцнены патрабаванні пры атрыманні прамысловага білета: для яго атрымання дадаткова павінна быць прадстаўлена інфармацыя з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях па фізічных асобах, якія будуць ажыццяўляць прамысловае рыбалоўства.

У частцы арганізацыі платнага аматарскага рыбалоўства выключаны інтэнсіўныя спосабы лоўлі рыбы, спрошчана лоўля рыбы на дарожку з суднаў з рухавікамі і падводнае паляванне ў фондзе запасу. Указам прадугледжана лоўля рыбы названымі спосабамі бясплатна ва ўсіх рыбалоўных угоддзях фонду запасу, за выключэннем рыбалоўных угоддзяў, пералік якіх вызначаецца Мінсельгасхарчам па ўзгадненні з Мінпрыроды, а таксама на вадатоках, на якіх не арганізавана платнае аматарскае рыбалоўства. Права на аматарскае рыбалоўства названымі спосабамі лоўлі застаецца за членамі РДГА «БТПР».

Па аматарскім рыбалоўстве ў сувязі з пастаянна ўзнікаючымі канфліктнымі сітуацыямі прамыславікоў і рыбаловаў-аматараў устаноўлена забарона на аматарскае рыбалоўства на адлегласці 50 м ад абазначаных прамысловых прылад рыбалоўства, з адначасовым выкарыстаннем больш як 5 прылад рыбалоўства аднаго або розных відаў з агульнай колькасцю кручкоў больш за 5 штук.

Уведзены патрабаванні да грамадзян, якія ажыццяўляюць аматарскае рыбалоўства.

Правіламі рыбалоўства пры заключэнні дагавора арэнды рыбалоўных угоддзяў для вядзення рыбалоўнай гаспадаркі прадугледжваюцца льготныя ўмовы на ажыццяўленне платнага аматарскага рыбалоўства ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, інвалідам I і II групы, непаўналетнім асобам да 16 гадоў і мясцовым жыхарам.

■ Блізкая ўлада

# ДАПАМОГА — У АДПАВЕДНАСЦІ З ЗАКОНАМ

**У Нарачанскім краі дастаткова вады — цэлая сістэма азёр. Разам з тым тут узнікла парадаксальная сітуацыя. Дзесьці залівае падворкі і нават вуліцы, а ў іншых месцах, наадварот, не хапае неабходнай у паўсядзённым ужытку гаючай вільгаці. Менавіта такія праблемы выйшлі на першы план падчас прыёму грамадзян губернатарам Мінскай вобласці Сямёнам Шапірам у Мядзельскім раёне.**



Фота БЕЛТА.

Жыхары аграгарадка Нарач скардзіліся, што на вуліцах Міра, Лугавой, Янкі Купалы і іншых знікла вада ў калодзежах. Прычына, на думку людзей, у асушэнні балот. Бясспрэчна, у гэтым вінаваты меліяратары, якія не прадугледзелі ўсе нюансы, але за іх недапрацоўкі разлічваюцца простыя людзі. Старшыня Мінаблвыканкама даручыў пракласці ў населеным пункце водаправод да верасня 2014 года. Пры гэтым ён нагадаў, што кошт пракладкі трубы павінен быць прымальным і паабяцаў дапамогу з абласнога бюджэту — 1 млрд рублёў.

Жыхарка Мядзела звярнулася да губернатара з просьбай дапамагчы адвесці ваду, якая падтоплівае двор. Сямён Шапіра, уважліва выслухаўшы жанчыну, канстатаваў, што мясцовыя ўлады вырашаць пытанне пры ўмове, што гаспадыня навядзе калі не глянец, то хаця б элементарны парадак на сваёй сядзібе і ў далейшым будзе яго падтрымліваць. Высветлілася, што заяўніца трымае вялікую падсобную гаспадарку, у тым ліку пяць кароў, малако і цялят здае дзяржаве. Старшыня аблвыканкама ўхваліў гэты ўнёсак у харчовую бяспеку краіны і папрасіў старшыню райвыканкама Ілью Шацько пасадзейнічаць, каб мясцовая гаспадарка адпускала для жывёлы сена і канцэнтраты па сабекошце.

Жыхары курортнага пасёлка Нарач, якія засяліліся ў новы кааператыўны дом, наракалі на якасць будаўніцтва: вокны і дзверы балконаў шчыльна не зачыняюцца, ва ўсе 54 кватэры задзімае вецер. Яны выклікалі прадстаўнікоў падрадчыка і субпадрадчыка. Тыя прыехалі, паглядзелі, але нават не зрабілі спробы ліквідаваць брак. Навасёлы прасілі таксама вярнуць 750 мільёнаў рублёў, якія яны пераплацілі за ацяпленне з-за нясвоечасовага ўводу дома ў эксплуатацыю. «Хіба павінны выправіць тыя, хто іх дапусціў», — выказаў сваё бачанне сітуацыі губернатар. Што да пераплаты за цяпло на працягу двух сезонаў, тут нельга даць адназначны адказ. Варта разабрацца ва ўсіх абставінах, выслухаць другі бок — прыватнае прадпрыемства «Барыт». Гэтую праблему павінен вырашыць суд.

Сямён Шапіра адзначыў, што дзяржава і мясцовая ўлада дапамагалі і будуць дапамагаць тым, хто мае патрэбу ў падтрымцы — нямоглым, сіротам, інвалідам, састарэлым. Толькі не тым, хто не жадае працаваць, а патрабуе для сябе нейкіх прывілей. «Усё павінна быць па законе», — зазначыў ён.

Пасля прыёму старшыня аблвыканкама сустрэўся з кіраўніцтвам і актывам Мядзельскага раёна, наведаў прадпрыемствы і аграэкатурыстычны комплекс, які будуецца ў вёсцы Наносы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ** ■

# ПАД ПІЛЬНЫМ КАНТРОЛЕМ УЛАД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Асобна Аляксандр Сцяпанаў адзначыў, што па шэрагу дамоў сарваныя тэрміны ўводу іх у эксплуатацыю былі звязаны з незабеспячэннем забудоўшчыкамі рытмічнага фінансавання іх будаўніцтва. Як следства, падраднымі арганізацыямі не забяспечана дастатковая колькасць рабочых на аб'ектах.

Таму мясцовыя ўлады прыцягваюць да адміністрацыйнай адказнасці кіраўнікоў арганізацый, якія перавысілі тэрмін будаўніцтва. Па гэтых парушэннях агульная сума штрафаў складае ўжо 913 млн рублёў.

Нагадаю, што, згодна з графікам, сёлета ў снежні неабходна ўвесці ў эксплуатацыю 14 даўгабудаў. Паводле інфармацыі Аляксандра Сцяпанава, з улікам ступені будаўнічай гатоўнасці ў названы тэрмін будзе забяспечаны ўвод у эксплуатацыю толькі трох жылых дамоў. Высокая ступень гатоўнасці і ў чатырох дамоў, якія планавалася ўвесці ў строй у наступным годзе.

На пасяджэнні выканкама адзначалася, што сістэма па працы з аб'ектамі звышнарматыўнага будаўніцтва ў горадзе створана, за імі замацаваны адказныя службы і службовыя асобы. Тым не менш, належных вынікаў пакуль не дасягнута. Гарадскія ўлады працягнуць кантраляваць сітуацыю з праблемнымі даўгабудамі. Старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька падкрэсліў, што вінаватыя за зрыў тэрмінаў уводу аб'ектаў у эксплуатацыю панясуць суровую адказнасць, аж да звальнення.

**Сяргей КУРКАЧ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## «ВОЛАТ» АРЫЕНТУЕЦЦА НА ЭКСПАРТ

**У вёсцы адкрылася прадпрыемства па вытворчасці паркетнай дошкі**

У вёсцы Чарнаўчыцы Брэсцкага раёна ўстаноўлена лінія па вырабе паркетнай дошкі прадпрыемства «ВолатТрэйд». Пакуль што на завод прыняты 32 работнікі з ліку мясцовых жыхароў. Але кіраўнікі адкрытага акцыянернага таварыства паабяцалі, што вытворчасць будзе пашырацца і, адпаведна, з'явяцца новыя рабочыя месцы. Пакуль сыравіну «ВолатТрэйд» атрымлівае з Расіі і Украіны, але тут маюць намер працаваць і з беларускімі пастаўшчыкамі, адзначыў падчас урачыстага адкрыцця прадпрыемства яго дырэктар Андрэй КАРАБЕЙКА. А вось прадаваць прадукцыю вытворцы з Чарнаўчыцаў будуць у заходнія краіны. На гэты конт ёсць дамоўленасць.

Праект рэалізуецца з прыцягненнем прамых замежных інвестыцый. Узведзены вытворчы будынак, адміністрацыйна-бытавы корпус, склады, уласная кацельная, якая працуе на адходах вытворчасці. Абсталяванне набыта ў Італіі і Чэхіі.

**Яна СВЕТАВА.**

## ПЕРШЫ — У БЕЛАРУСІ, СЯРОД ЛІДАРАЎ — У СВЕЦЕ

**У Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта — дзень народзінаў. Яму — ужо 93 гады. Сёння гэта навукова-адукацыйны інавацыйны комплекс, які актыўна развіваецца і імкнецца заняць першыя пазіцыі ў сусветнай адукацыйнай прасторы. Па некаторых параметрах ён ужо лідзіруе ў нашай краіне.**

Справа ў тым, што сёлета ўніверсітэт узяў удзел у першым этапе праграмы «Глабальны Сусветны Камунікатар. Адукацыя і навука» па інфармацыйна-камунікацыйных параметрах афіцыйных старонак у інтэрнэце. Па гэтым паказчыку БНТУ знаходзіцца на 1-м месцы сярод 54 ВНУ нашай краіны і на 115-м сярод універсітэтаў свету.

Увогуле БНТУ — гэта 17 факультэтаў, 110 кафедраў, 8 міжнародных навуковых цэнтраў, 3 інстытуты павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, навукова-тэхналагічны парк «Палітэхнік», 72 філіялы кафедраў на найбуйнейшых прамысловых прадпрыемствах краіны. «У перспектыве, — кажа рэктар універсітэта, акадэмік НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар Барыс Хрусталёў, — плануецца адкрыццё інстытута Канфуцыя і вучэбна-навукова-вытворчага кластара на базе БНТУ». За 93 гады ўніверсітэт падрыхтаваў каля 200 тысяч спецыялістаў для Беларусі і каля 6 тысяч — для замежных краін. ВНУ мае статус базавай арганізацыі краін СНД па вышэйшай тэхнічнай адукацыі. Амаль 50-тысячны калектыў звычайна называе ўніверсітэт кузняй кваліфікаваных кадраў для Беларусі.

**Уладзіслаў СОЎПЕЛЬ.**

## ЧАТЫРЫ ЧАЛАВЕКІ ЗАГІНУЛІ Ў ДТЗ У МАЛАДЗЕЧАНСКІМ РАЁНЕ

**Чатыры чалавекі загінулі 9 снежня ў ДТЗ у Маладзечанскім раёне, паведамілі БЕЛТА ў МНС Беларусі.**

Аварыя адбылася раніцай каля 7.30 недалёка ад вёскі Курасоўшчына Маладзечанскага раёна. Сутыкнуліся два легкавыя аўтамабілі «Сітраен-Ксенція» і «Лянча-Лібра», а таксама грузавы «Мерседэс». У момант ДТЗ у «Сітраене» знаходзіліся 3 чалавекі. З усіх выжыў толькі адзін пасажыр — ён дастаўлены ў Маладзечанскую цэнтральную раённую бальніцу. У пацярпелага — траўмы ніжніх канечнасцяў, скураныя драпіны ў вобласці лба і носа. У аўтамабілі «Лянча» знаходзіліся двое, выжыць не ўдалося нікому.

Целы загінулых удалося выцягнуць з пагнутых аўтамабіляў толькі пры дапамозе гідраўлічнага інструменту.

## ПРАЗ КРАІНУ... З ЧУЖЫМІ ПРАВАМІ

**Жыхар Брэсцкай вобласці на аўто ехаў у Віцебск з чужымі правамі, і добра, што «папаўся» супрацоўніку ДАІ.**

— У Лепельскім раёне гэты кіроўца быў спынены супрацоўнікам ДАІ. Афіцэр, агледзеўшы некалькі разоў вадзіцельскае пасведчанне і адпаведны талон, вырашыў іх праверыць па спецыяльнай базе выдадзеных дакументаў і правапарушэнняў. Як жа ён здзівіўся, калі даведаўся пра тое, што дакументы выдадзены на іншага чалавека. Аказваецца той, хто сядзеў за рулём, пазбаўлены права кіравання транспартным сродкам на тры гады — за кіраванне машынай у нецвярозым стане, — расказаў Яўген Кржысінскі, пракурор аддзела па наглядзе за дазнаннем пракуратуры Віцебскай вобласці.

Падчас праверкі высветлілася, што грамадзянін прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці — за парушэнне правілаў дарожнага руху, калі ездзіў з несапраўднымі правамі. Цікава, што вадзіцельскае пасведчанне ён купіў на мясцовым рынку — усяго за 200 долараў. Пры гэтым, акрамя вадзіцельскай катэгорыі «В», якой ён быў пазбаўлены, яму яшчэ выдалі і катэгорыю «С», на якую ён ніколі не вучыўся. Заведзена крымінальная справа. Хітраму кіроўцу могуць абмежаваць волю тэрмінам да двух гадоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ КОЛАЎ

**У двух жыхароў Клічаўскага раёна на Магілёўшчыне канфіскавалі асабісты транспарт.**

Алкагольная залежнасць каштавала аднаму з жыхароў раёна аўтамабіля «Фальксваген-Гольф». Як паведаміла суддзя Клічаўскага раёна Ларыса Корза, такое рашэнне суд прыняў пасля таго, як абвінавачваны сеў за руль жончынай машыны ў нецвярозым стане. Справа пагоршылася тым, што ён ужо быў аднойчы асуджаны за падобнае парушэнне і не меў права наогул кіраваць транспартам. У выніку мужчына не толькі пазбавіўся аўтамабіля, але яшчэ і свабоды на цэлы год, а таксама правоў кіроўцы на 5 гадоў.

А ў пачатку снежня аналагічны прысуд атрымаў 25-гадовы работнік мясцовага СВК. У даход дзяржавы канфіскаваны яго матацыкл «Ява-35».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ГРУШЫ НА ДАРОЗЕ

**Увечары на 28-м кіламетры аўтадарогі Мінск — Віцебск паблізу вёскі Сілічы Лагойскага раёна адбылося дарожна-транспартнае здарэнне з удзелам фуры. Спатрэбілася дапамога ў яе падняцці.**

Кіроўца грузавога аўтамабіля «Мерседэс» не справіўся з кіраваннем і перакуліўся. Фура ехала з Бельгіі ў Расійскую Федэрацыю — у Смаленск. Аўтамабіль перавозіў больш як 21 тону груш. Каб падняць фуру, на месца прыбылі кран, аварыйна-выратавальны аўтамабіль са спецыялістамі рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС. На шчасце, пацярпелых не было, машына атрымала нязначныя пашкоджанні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЦІ МАЦІ ГЭТА?

**У Баранавічах маці задушыла паўгадовую дачку, а затым спрабавала накласці рукі на сябе. Пра гэта «Звяздзе» паведамілі ў Міністэрстве ўнутраных спраў.**

Дзяўчынку знайшлі ў кватэры мёртвай. Паводле заключэння судова-медыцынскай экспертызы смерць наступіла ад механічнай асфіксіі. Папярэдне ўстанавілі, што малечу задушыла рукамі яе ж маці. Пасля гэтага жанчына спрабавала паканчыць з сабой. Цяпер яна знаходзіцца ў бальніцы, перад якой выстаўлены пост міліцыі. Упраўленне Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці завяло і расследуе крымінальную справу па п 2. арт. 139 Крымінальнага кодэкса (забойства заведама малалетняга).

Як высветлілася, жанчыне ўсяго толькі 23 гады, яна знаходзілася ў дэкрэтным водпуску. Яе дачцэ было ўсяго паўгода — дзяўчынка нарадзілася 29 мая 2013 года.

**Надзея ПАЎЛАВА.**

■ Вынікі тыдня

# РАШУЧЫЯ КРОКІ ВА ЎМОВАХ НЕВЫРАЗНЫХ ПЕРСПЕКТЫЎ

**Мінулы тыдзень быў багаты на падзеі як у Беларусі, так і за яе межамі. Нестабільнасць міжнароднай абстаноўкі выклікала да жыцця рашучыя крокі беларускага кіраўніцтва ўнутры краіны.**

Галоўнай падзеяй еўрапейскага ўзроўню ў папярэднія сем дзён сталі, безумоўна, пратэсты і антыўрадавыя выступленні ва Украіне. Тое, што пачалося як выступ у падтрымку «еўрапейскага шляху», хутка перарасло ў масавыя пратэсты з палітычнымі лозунгамі адстаўкі прэзідэнта і ўрада. У гэтым працэсе немалую ролю адыграла разнароднасць украінскага істэблішменту, частка якога перайшла на бок «рэвалюцыянераў». Больш за тое, стала відавочна, што пэўныя колы ва ўладзе працягваюць гуляць на яе дыскрэдытацыю.

Але ў той жа час апазіцыя, у якой на першым этапе была масавая і актыўная падтрымка з боку часткі насельніцтва, не змагла канвертаваць яе ў рэальныя палітычныя дывідэнды. Ісці на адкрыты гвалт апазіцыйныя лідары не могуць і не хочуць, а для адпраўкі ўрада ў адстаўку ім не хапае галасоў у Вярхоўнай Радзе.

Несумненна, выступы ва Украіне з'яўляюцца адлюстраваннем, у першую чаргу, міжнародных працэсаў — сутыкнення ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе інтарэсаў Еўрасаюза, Расіі і ЗША. Украінскія палітыкі ў гэтай вялікай гульні з'яўляюцца пешкамі, а ўкраінскі народ — фактычна статыстам, хоць і з некай актыўнай роляй. І, мабыць, гэта найлепшым чынам паказвае рэальную цану той мадэлі дэмакратыі, якая створана ва Украіне і якую часта спрабуюць ставіць у прыклад Беларусі.

На гэтым фоне Прэзідэнт Беларусі выказаўся з нагоды дэмакратыі ў нашай краіне. Дакладней, запатрабаваў, каб выбарчыя кампаніі найбліжэйшых гадоў (мясцовыя выбары 2014 года, прэзідэнцкія выбары 2015 года і парламенцкія выбары 2016-га) сталі праявай сапраўднай дэмакратыі. Вядома, ацэнка гэтых выбараў іншымі краінамі часта не залежыць ад ходу самога выбарчага працэсу. Беларусь не раз сутыкалася з падрыхтаванымі дакладамі назіральнікаў пра надуманыя парушэнні заканадаўства, якое гэтыя назіральнікі нават не вывучылі.

Але высокі ўзровень арганізацыі электаральных працэдур у любым выпадку з'яўляецца важным фактарам забеспячэння легітымнасці вынікаў выбараў. Важна і тое, каб кіраўніцтва краіны ў крызісны перыяд атрымала сапраўдны мандат ад беларусаў на правядзенне структурных рэформаў эканомікі, што, мяркуючы па ўсім, непазбежна ў бліжэйшыя гады.

У размове аб выбарчых кампаніях кіраўнік дзяржавы таксама даў зразумець, што яны будуць праводзіцца ў адпаведнасці з закладзеным у заканадаўстве палітычным раскладам, без істотнага пераносу дат. Бліжэйшыя выбары — у мясцовыя Саветы дэпутатаў — пройдуць у Беларусі 23 сакавіка 2014 года.

Мінулы тыдзень быў адзначаны цэлым шэрагам кадравых прызначэнняў. Дыпламатычны корпус папоўніўся новымі пасламі ў Турцыі і Іраку, Польшчы, Літве, Аргенціне, Македоніі, Эфіопіі, новым генеральным консулам у польскім Гданьску. Перад новымі прадстаўнікамі Беларусі ў замежных дзяржавах былі пастаўлены, у першую чаргу, эканамічныя задачы па нарошчванні экспарту.

Яшчэ больш важнае кадравае рашэнне было прынята 5 снежня, калі кіраўнік дзяржавы прызначыў Аляксандра Мяжуева на пасаду дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь. Кадравы ваенны, дагэтуль быў дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь, узначальваў пастаянную камісію па нацыянальнай бяспецы. Гэта значыць, фактычна ўнікаў у справы той сферы, якой будзе цяпер непасрэдна кіраваць.

Прызначэнне было нечаканым: пасля сыходу з гэтай пасады Леаніда Мальцава эксперты абмяркоўвалі зусім іншыя кандыдатуры на пасаду кіраўніка Савета бяспекі. Аднак аналіз біяграфіі новага Дзяржсакратара паказвае, што ён не з'яўляецца выпадковым чалавекам на гэтым месцы і добра дасведчаны ў пытаннях ваеннай і стратэгічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і ўсходнееўрапейскага рэгіёна.

Важным крокам першага тыдня снежня стаў пачатак інтэнсіўнай падрыхтоўкі да інтэграцыйных форумаў на вышэйшым узроўні. 13 снежня пройдзе пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, затым — пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы і Вышэйшага савета эканамічнага супрацоўніцтва. У гэты перыяд будуць вырашаны многія ключавыя пытанні эканамічнага развіцця Беларусі і іншых краін рэгіёна ў 2014 годзе — аб'ёмы пастаўкі нафты, парадак збірання экспартных пошлін на нафтапрадукты, лёс саюзных праектаў і праграм, пытанні стварэння сумесных прадпрыемстваў і многае іншае.

Частка гэтых пытанняў была абмеркавана на сустрэчах прэм'ер-міністра і Прэзідэнта краіны з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Рыгорам Рапотам, якія прайшлі 5 снежня. Праўда, на наступны дзень Аляксандр Лукашэнка зрабіў заяву, якая сведчыць аб захаванні пэўных рознагалоссяў паміж Мінскам і Масквой. На ўзнагароджанні аўтарскага калектыву Мінскага завода колавых цягачоў Прэзідэнт выказаўся супраць прыватызацыі гэтага прадпрыемства. Калі ж яго і прадаваць, «то не спажыўцам» (гэта значыць, не Расіі), заявіў кіраўнік дзяржавы.

Улічваючы, што ў той жа дзень прагучала заява Дзмітрыя Мядзведзева аб памылковасці дзеянняў Беларусі ў дачыненні да Уладзіслава Баўмгертнера, можна з поўнай упэўненасцю казаць, што заканчэнне 2013 года для постсавецкай прасторы будзе цікавым.

**Юрый ЦАРЫК** ■

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне начальніку фінансава-эканамічнага аддзела Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Мурашовай Вользе Дзмітрыеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Калектыў выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні сваёй супрацоўніцы Бадзеевай Таццяне Мікалаеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ДОБРЫХ ЦЭН ШМАТ НЕ БЫВАЕ

**Выстаўка-распродаж нехарчовых тавараў мінскіх вытворцаў прайшла ў сталічным Палацы моладзі напярэдадні выхадных. Пакупнікоў бытавой тэхнікі, адзення, абутку, галантарэі, канцэлярскіх тавараў і касметыкі прываблівалі кошты, якія былі на 20-40% ніжэйшыя, чым на гандлёвых прылаўках маленькіх крам і вялікіх супермаркетаў.**

Сярод удзельнікаў выставы былі такія вядомыя беларускія брэнды, як «Гарызонт», «Атлант», «Камволь», прадпрыемствы Беллегпрама па пашыве адзення «Алеся» і «Авіла».





■ Асаблівыя сярод нас

# АДКРЫЕМ СВЕТ ДЛЯ «ЛЮДЗЕЙ ДАЖДЖУ»

**«У школе ёсць прадметы, якія мой сын вельмі любіць, а ёсць і такія, што катэгарычна не любіць. Колькі мы ні біліся, матэматыка яму не даецца. Затое падабаецца англійская мова, бо ў яго цудоўная памяць і ён хутка запамінае словы. А з гэтага года ён нечакана заспяваў: пачалі браць індывідуальныя ўрокі музыкі, і аказалася, што Цімур мае здольнасці да спеваў», — кажа Ірына Дзяргач, якая выхоўвае сына-чацвёртакласніка з дыягназам «аўтызм».**

## НЕ ТОЛЬКІ ДАВАЦЬ ВЕДЫ, АЛЕ І ВУЧЫЦЬ КАМУНІКАВАЦЬ

Памылка — лічыць аўтызм псіхічным расстройствам ці адсталасцю ў развіцці. Гэта, хутчэй, асаблівасць, якую пакуль не здольны патлумачыць ні медыцына, ні навука. Сярод аўтыстаў можна сустрэць людзей, якія не могуць самастойна есці, але беспамылкова праводзяць у галаве складаныя матэматычныя разлікі. Стаўленне да такіх «людзей дажджу» ў нашым грамадстве пакуль неадназначнае, ды і пра сам дыягназ людзі амаль нічога не ведаюць.

Таму, калі прыйшла пара аддаваць Цімура ў школу, пра стварэнне спецыялізаваных АВА-класаў яшчэ нават гаворкі не было. Пайшлі вучыцца разам з дзяўчынкай, якая слаба чула: такім чынам атрымаўся клас, у які трапілі двое асаблівых дзяцей. Але, нягледзячы на такую спробу інтэграцыі, праблеме аўтызма там надаецца недастаткова ўвагі.

«Такім дзецям вельмі доўга трэба тлумачыць, здавалася б, звычайныя рэчы: як паводзіць сябе, як звяртацца да дарослых, як гуляць, наладжваць стасункі, весці дыялог, — тлумачыць Ірына. — Па праграме з цяжкасцямі ў навучанні, куды трапіў мой сын, толькі адна гадзіна групавых заняткаў з псіхолагам на тыдзень. Відавочна, што гэтага недастаткова: яму патрэбны заняткі сам-насам штодзённа. А налета яму ісці ў пяты клас, і я не ўяўляю, што будзе. Пакуль дзіця вялі адзін настаўнік і адзін дэфектолаг, усё было добра. Калі ж з'явіцца шмат выкладчыкаў-прадметнікаў, пачнуцца праблемы, бо кожнаму растлумачыць, што такое аўтызм, складана. Таму што з выгляду мой сын — абсалютна здаровы, бойкі, балбатлівы хлопчык».

Як лічыць Ірына Дзяргач, на этапе пачатковай школы самае галоўнае — стварыць адаптаванае пад аўтыстаў асяроддзе. Дэфектолаг і псіхолаг павінны не толькі даваць веды, але і вучыць дзіця камунікаваць. На ступені сярэдняй школы неабходны цьютар — чалавек, які б паўсюдна суправаджаў дзіця ў школе.

«Калі мы ішлі ў першы клас, бацькі аднакласнікаў яго пабойваліся. А цяпер яны кажуць: «Вы пераходзіце ў пяты клас, гэта ж вашага Цімура пакрыўдзіць могуць», — кажа жанчына. І адзначае, што паводле Кодэкса аб адукацыі, кожнае дзіця мае права на атрыманне ведаў. Навучальную ўстанову выбіраюць бацькі. І менавіта ўстанова адукацыі абавязана стварыць умовы, якія адпавядалі б асаблівасцям развіцця канкрэтнага дзіцяці. Але ў рэчаіснасці, калі бацькі такіх дзетак звяртаюцца ў дзіцячыя садкі і школы, ім адказваюць, што няма адпаведных спецыялістаў і інтэграваных класаў.

## МАЛЕНЬКІМІ КРОКАМІ — ДА ВЯЛІКАЙ СПРАВЫ

Але цяпер у гэтай сферы з'яўляюцца станоўчыя зрухі. Шмат намаганняў на гэта накіроўвае Міжнародная дабрачынная грамадская арганізацыя «Дзеці. Аўтызм. Бацькі», створаная два гады таму. Арганізацыя прадстаўляе інтарэсы беларускіх сем'яў, якія выхоўваюць «аўцят». Бацькам, якія ўваходзяць у суполку, хоць і з пэўнымі цяжкасцямі, але ўдаецца дагрукацца да чыноўнікаў і грамадскасці. Адным з вынікаў дзейнасці арганізацыі стала адкрыццё сёлета першага інтэграцыйнага АВА-класа на базе агульнаадукацыйнай сярэдняй школы №5 у Мінску. Гэта пілотны праект, які мусіць пакласці пачатак інклюзіі дзяцей з аўтызмам у нашай краіне, іншымі словамі, дапамагчы ім паўнавартасна ўключыцца ў грамадства. Асаблівасць такога класа ў тым, што аўтысты вучацца разам са звычайнымі дзецьмі, але пры гэтым спецыяльна ўведзены 0,5 стаўкі педагога-псіхолага і 1,5 стаўкі памочніка выхавальніка (цьютара). Праўда, асаблівых першакласнікаў, якія атрымалі магчымасць вучыцца ў АВА-класе, пакуль толькі трое — неабходны для інтэграцыі мінімум. Пры тым, што нават афіцыйная статыстыка паведамляе: на 1 студзеня 2013 года ў краіне зарэгістравана каля 700 дзяцей з аўтызмам. Зрэшты, ёсць яшчэ неафіцыйныя звесткі, паводле якіх у Беларусі жыве каля 10 тысяч дзяцей з такім дыягназам (сярод іх 2000 — у Мінску).



«Ва ўсім свеце праблема аўтызму ахоплівае тры ведамствы: аховы здароўя, адукацыі і сацыяльнай абароны, — гаворыць **кіраўнік МДГА «Дзеці. Аўтызм. Бацькі» Таццяна ЯКАЎЛЕВА.** — Аўтызм — гэта не псіхіятрычнае захворванне, гэта псіхасаматычны стан, і асноўная доля адказнасці па яго карэкцыі прыпадае менавіта на сістэму адукацыі. Міжнародная практыка паказвае, што каля 70% такіх дзяцей пры належнай псіхолага-педагагічнай падтрымцы ў сем гадоў размаўляюць і ідуць у агульнаадукацыйную школу. Чым раней спецыялісты пачынаюць працаваць з праблемамі камунікацыі і сацыялізацыі маленькага аўтыста, тым больш шанцаў у яго стаць паўнавартасным членам грамадства».

Цяпер Беларусь стаіць на парозе падпісання Канвенцыі па правах людзей з інваліднасцю. У ёй існуе пункт, прысвечаны інклюзіўнай адукацыі. І сёння бацькі маленькіх аўтыстаў бачаць выйсце менавіта ва ўключэнні сваіх дзяцей у агульную сістэму атрымання ведаў. Бо пакуль што многія дзеткі з асаблівасцямі вымушаны заставацца на надомным навучанні ў чатырох сценах, што не спрыяе іх сацыялізацыі.

**На 1 студзеня 2013 года ў краіне зарэгістравана каля 700 дзяцей з аўтызмам. Зрэшты, ёсць яшчэ неафіцыйныя звесткі, паводле якіх у Беларусі жыве каля 10 тысяч дзяцей з такім дыягназам (іх 2000 — у Мінску).**

Таццяна Якаўлева паведаміла, што сёлета па ініцыятыве МДГА «Дзеці. Аўтызм. Бацькі» адбылося пасяджэнне Мінгарвыканкама з удзелам камітэтаў па ахове здароўя, адукацыі і сацыяльнай абароны, на якім было прынята рашэнне аб адкрыцці трох рэсурсных цэнтраў па аўтызме ў Мінску. Налета плануецца адкрыць яшчэ адзін адаптацыйны клас для дзетак-аўтыстаў на базе сярэдняй школы ў Фрунзенскім раёне.

«Але падрыхтоўка да школы павінна мець пэўную базу, — адзначае Таццяна Якаўлева, — таму Мінгарвыканкам ужо заклаў сродкі на ўвядзенне мадэлі сацыялізацыі нашых дзетак у дзіцячым садку. Ужо адкрыўся рэсурсны цэнтр для аўтыстаў пры дзіцячым садку № 235».

Відавочна, што вопыту па адаптацыі дзяцей з расстройствамі аўтычнага спектра ў нашай краіне няма. Таму члены арганізацыі «Дзеці. Аўтызм. Бацькі» пераймаюць замежныя мадэлі, у прыватнасці, амерыканскую, якая лічыцца перадавой у гэтай сферы. Карыстаюцца досведам калег з Расіі, запрашаюць спецыялістаў з Вялікабрытаніі. Большая ж частка працы па адаптацыі маленькіх аўтыстаў прыпадае на валанцёраў — неабыякавых людзей, якія бескарысліва працуюць цьютарамі, арганізуюць сувязь з грамадскасцю, ствараюць сайты і робяць шмат іншых рэчаў. Вялікую ролю ў валанцёрстве адыгрывае праваслаўнае брацтва ў гонар Святога апостала Іаана Багаслова Мінскай епархіі. Але, каб дапамагчы дзецям, неабавязкова быць членам брацтва ці якой-небудзь грамадскай арганізацыі. Рабіць добрыя справы можа кожны, дастаткова проста мець добрае сэрца і адкрытую душу.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

**P. S.:** ***Падчас падрыхтоўкі матэрыяла стала вядома, што міністр адукацыі Сяргей Маскевіч прапанаваў нарматыўна замацаваць тэрмін «інклюзіўная адукацыя» ў Кодэксе аб адукацыі***

■

■ Будзе свята!

# Перадінавагодні гандаль вабіць зніжкамі і стварае настрой

**Мінскі завод пеністых він сёлета паставіў у гандлёвую сетку каля 1,7 мільёна бутэлек шампанскага, а да канца года запланавана адгрузіць яшчэ 0,8 мільёна бутэлек. Апроч гэтага, на аптовых базах у рознічнай сетцы створаны таварныя запасы ў памеры 0,7 мільёна бутэлек, паведамілі ў Міністэрстве гандлю аператыўную інфармацыю адносна перадінавагодняга гандлю.**

Кандытарскія фабрыкі «Камунарка», «Спартак», «Слодыч», «Чырвоны харчавік» і іншыя паставілі ў гандлёвую сетку 380 тысяч штук навагодніх падарункаў больш чым 75 найменняў коштам ад 30 да 265 тысяч рублёў. Да канца года будзе адгружана яшчэ 200 тысяч штук.

Продаж натуральных навагодніх дрэў у сталіцы будзе арганізаваны з 23 па 31 снежня з рэжымам працы елачных кірмашоў з 10.00 да 19.00 без абедзенных перапынкаў і выхадных дзён. Для продажу на іх запланавана атрымаць каля 30 тысяч дрэў. Мяркуецца, што рознічныя цэны ў залежнасці ад вышыні складуць: да 1 метра — 32—78 тысяч рублёў, да 2 метраў — 35—103 тысячы рублёў, да 3 метраў — 43—119 тысяч рублёў. Акрамя таго, у гандлёвую сетку будзе пастаўлена звыш 30 відаў елак са штучных матэрыялаў, у тым ліку дэкарыраваных, вышынёй ад 45 сантыметраў да 3 метраў па рознічных цэнах ад 62 тысяч да 1 300 тысяч рублёў, больш за 200 відаў (1 500 разнавіднасцяў) ёлачных упрыгажэнняў у шырокім цэнавым дыяпазоне.

Для зручнасці пакупнікоў прадугледжаны аптымальны рэжым працы сталічнай рознічнай гандлёвай сеткі: 25 і 31 снежня і 7 студзеня харчовыя і нехарчовыя крамы будуць працаваць па рэжыму рабочага дня; 1 студзеня харчовыя крамы будуць працаваць з 10.00 да 18.00, у нехарчовых будзе выхадны. З 16 снежня па 1 студзеня аб'екты грамадскага харчавання будуць працаваць без выхадных дзён, рэстараны і кавярні — да 6 гадзін раніцы (за выключэннем тых, што размешчаны ў памяшканнях, убудаваных у жылыя дамы) пры наяўнасці замоў на правядзенне святочных мерапрыемстваў. Пачынаючы з 16 снежня і па 15 студзеня забаронена закрыццё гандлёвых аб'ектаў на рамонт, інвентарызацыю, санітарныя дні і іншыя падобныя мерапрыемствы.

Арганізацыямі бытавога абслугоўвання горада запланавана падаўжэнне рэжымаў работы ў перадсвяточныя дні: 24, 31 снежня і 6 студзеня па рэжыме працоўнага дня, для цырульняў — з заканчэннем працы не раней за 21 гадзіну. Сталічны сэрвіс напярэдадні навагодніх свят прапануе таксама традыцыйныя паслугі (дастаўка падарункаў, віншаванняў ад Дзеда Мароза і Снягуркі, пракат карнавальных і маскарадных касцюмаў і г.д.).

Буйныя ўнівермагі горада ўжо пачалі праводзіць пашыраныя акцыі, распродажы з прадастаўленнем зніжак на харчовыя і нехарчовыя тавары. Напрыклад, «ЦУМ» дае зніжкі з рознічных цэн у памеры ад 10 да 50 працэнтаў на спарттавары, культтавары, парфумерна-касметычныя. Разам з прадпрыемствамі-вытворцамі праводзяцца акцыі на такія групы тавараў, як тэкстыльныя, трыкатажныя, швейныя, а таксама на дывановыя вырабы, абутак, парфумерна-касметычныя, галантарэйныя тавары і г.д.

«ГУМ» прадастаўляе зніжкі з рознічных цэн ад 5 да 25 працэнтаў на ювелірныя вырабы з золата, вырабы мужчынскага, жаночага і дзіцячага асартыменту, электратавары, фота-, радыётавары, сувеніры і інш.

Ва ўнівермагу «Беларусь» праводзяцца акцыі па зніжэнні рознічных цэн ад 15 да 50 працэнтаў на швейныя вырабы «Купалінкі», «Вяснянкі», на трыкатажныя і панчошна-шкарпэткавыя вырабы «Купалінкі», абутак «Белвест».

Гандлёвы дом «На Нямізе» праводзіць пашыраныя распродажы з уручэннем прызоў і падарункаў, а таксама са зніжкай рознічных цэн ад 10 да 50 працэнтаў на швейныя вырабы мужчынскага, жаночага і дзіцячага асартыменту, бялізнавага трыкатажу «Калінкі», «Вяснянкі», ювелірныя вырабы (заручальныя пярсцёнкі) гомельскага «Крыстала» і інш.

У мэтах папулярызацыі нацыянальнай кухні і развіцця культуры харчавання з 9 па 15 снежня будзе праведзены Тыдзень беларускай кухні.

Рыхтуюцца сустрэць пакупнікоў рады з прыгожых драўляных домікаў «Калядны кірмаш», якія разгорнуць свой гандаль навагоднімі падарункамі, сувенірамі і прысмакамі з 16 снежня па 15 студзеня з 12.00 да 20.00 на тэрыторыі Кастрычніцкай плошчы і каля Палаца спорту. Акрамя таго, 25 снежня з 10.00 да 20.00 каля Палаца спорту плануецца правядзенне агульнагарадскога кірмашу «Чароўныя каляды». Святочныя кірмашы пройдуць і ва ўсіх адміністрацыйных раёнах горада.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

# БЫЦЬ, ЯК УСЕ

## Ад абмежаваных да неабмежаваных магчымасцяў

**У Багушэўскім доме-інтэрнаце для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, што ў Сенненскім раёне, упершыню ў Беларусі рэалізуецца праект па сацыяльнай інтэграцыі дзяцей і моладзі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Пры інтэрнаце ёсць два дамы для былых выхаванцаў установы ва ўзросце ад 18 гадоў. Жыльцы там жывуць камунамі, трымаюць падсобную гаспадарку — кароў і курэй, вырошчваюць гародніну...**

Пасёлак Багушэўск да 1960-х гадоў быў цэнтрам аднайменнага раёна. У вёсцы Рабцава, што побач з ім, знаходзіцца дом-інтэрнат для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Некаторым з выхаванцаў ужо... за трыццаць гадоў.

— У нас тут больш як 260 чалавек ва ўзросце ад 4 да 35. Дзякуючы міжнароднай грамадскай арганізацыі «Свет без межаў» мы першымі пачалі рэалізоўваць праект па сацыяльнай адаптацыі нашых выхаванцаў. 12 чалавек ужо жывуць у двух будынках, якія першапачаткова прызначаліся для засялення супрацоўнікаў інтэрната, — расказвае **Віктар СУВОРАЎ, дырэктар дома-інтэрната.**

Катэджы, дзе жывуць людзі з абмежаванымі магчымасцямі, знаходзяцца непадалёк ад інтэрната. Іх здалі «пад ключ», дзякуючы дапамозе шведскага і ірландскага дабрачынных фондаў.

У адным з дамоў жывуць чатыры хлопцы і дзве дзяўчыны ва ўзросце ад 18 і за 30 гадоў. Гаспадарку ім дапамагае весці супрацоўнік інтэрната. Але гэта не значыць, што яна ўсё за іх робіць. Самі хлопцы і дзяўчаты зрабілі рамонт, самі з крамы прадукты прыносяць, самастойна кухараць і гэтак далей. А супрацоўніца толькі дапамагае ім.



Вырабы выхаванцаў.

Шведы былі здзіўлены, калі пачулі, што моладзь не толькі забяспечвае сябе прадуктамі харчавання (дзякуючы агароду), але і жывёлу трымае. А лішкі гародніны і малака прадаюць. Летась на гэтым зарабілі 15 мільёнаў рублёў, сёлета — больш як 10 мільёнаў. Пакупнікі — у асноўным супрацоўнікі інтэрната.

Падчас размовы з жыльцамі незвычайных дамоў высветлілася, што некаторыя дзяўчаты працуюць у інтэрнаце — дапамагаюць даглядаць ляжачых хворых. Хлопцы займаюцца сельскай гаспадаркай, працуюць у сельскагаспадарчых кааператывах, у фермераў.

Замежных гасцей таксама ўразіла ферма, сцены якой звонку ўпрыгожваюць малюнкі. Іх аўтары — жыхары катэджаў.

Калі б не новая форма працы з такімі людзьмі, іх бы перавялі жыць у інтэрнаты для дарослых або, у лепшым выпадку, працаўладкавалі б, калі здароўе дазваляла. Але, вядома, наўрад ці ім там было б больш утульна. Ды і жыць самастойна нават пры тым, што ты — чалавек з абмежаванымі магчымасцямі... Аб гэтым яшчэ некалькі гадоў таму выхаванцы інтэрната і не марылі.



У камп'ютарным класе.

У гэтым інтэрнаце адбываюцца «звычайныя цуды». Выхаванка аднаўлена ў дзеяздольнасці. У дачыненні да двух выхаванцаў задаволена хадайніцтва аб гэтым жа. І яшчэ ў пяці ёсць аналагічная перспектыва. Гэта — вынік стараннай працы персаналу інтэрната, укаранення перадавых праграм па выхаванні і адаптацыі да жыцця па-за сценамі ўстановы.

Пасля экскурсіі па вышэйзгаданых дамах дырэктар паказаў установу, якой непасрэдна кіруе. У наступным годзе ёй споўніцца 40 гадоў.

Пазнаёміўся з выхаванцам — 19-гадовым хлопцам па прозвішчы Залаты.

— Амаль тры гады я тут, а раней жыў у Віцебскім раёне, — тут жа амаль па-ваеннаму «дакладвае» хлопец, якога ўразіла, што ім зацікавіўся карэспандэнт. — Як праходзіць наш дзень? Калі прачнуліся, ложкі засцілаем, прыбіраемся і ідзём на снядана. Потым на працу. Я вырабамі з дрэва займаюся. Лыжкі, лапаткі, дошчачкі, вешалкі для кветак — усё раблю. І мне за гэта плацяць. За месяц мільён рублёў атрымаў.

Хлопец расказаў, што сувязь са сваякамі ў яго страчана. Тата памёр, а мама жывая, але прыязджала ў апошні раз да яго ў госці перад «тым» Новым годам. Уладзімір нарадзіўся ў шматдзетнай сям'і.

— Я сярэдні брат, ёсць яшчэ два малыя — Алег і Дзімка, іх ужо разабралі па інтэрнатах. У Глыбокім старэйшая сястра жыве. Яшчэ ёсць старэйшы брат, ён за Віцебскам недзе жыве. Чым займаецца — не магу дакладна сказаць.

У інтэрнаце шмат «зорак». Напрыклад, тут жыве хлопец, які малюе нагамі, яшчэ адзін — пераможца чэмпіянату краіны па яздзе на інвалідных калясках. Ёсць і «залаты» голас — «зоркі» шансона на фоне яго могуць адпачываць. Сярод выхаванцаў — пераможцы розных конкурсаў. Напрыклад, адзін хлопец ездзіў у Іерусалім — у якасці ўзнагароды за лепшы твор дэкаратыўна-выяўленчага мастацтва. Ён жа паспрабуе выйграць паездку ў Марока, калі пераможа ў конкурсе навагодніх падарункаў, прысвечаных гэтай краіне.

У адным з класаў, дзе праводзіліся заняткі, паказалі дыск з аўтографам і цёплымі словамі выхаванцам інтэрната ад «зоркі» расійскай эстрады Ігара Нікалаева. Ён такім чынам падзякаваў за падарунак, зроблены іх рукамі, які перадалі спеваку, калі ён выступаў на магілёўскім фестывалі «Залаты шлягер».

Інтэрнацкая «майстэрня Зайцавай» названа ў гонар швачкі, якая вучыць шыць. Цікава, што, акрамя верхняга зімовага адзення, у інтэрнаце ўсё астатняе — прадукцыя, пашытая самімі выхаванцамі.



Ферма, дзе працуе моладзь.

Тут ёсць нават студыя гуказапісу, аб якой могуць толькі марыць музыканты-пачаткоўцы ды і некаторыя прафесіяналы. Паводле слоў дырэктара, гэта — падарунак замежных мецэнатаў. Яшчэ больш уражвае, што ў гэтай студыі працаўнікі і выхаванцы ўстановы запісалі дыск, аранжыроўку да якога зробяць у Швецыі — у прафесійнай студыі гуказапісу. Дыск будзе выкарыстоўвацца для псіхатэрапіі.

Шведскіх гасцей уразілі камп'ютарны клас — цэнтр інтэрнацкай лакальнай віртуальнай сеткі, трэнажорная зала, а таксама пакой рэлаксацыі. У апошнім без медыкаментаў можна зняць стрэс, павысіць настрой.

— Прыемна здзіўляе, як многа зроблена ў гэтым інтэрнаце для таго, каб людзі з абмежаванымі магчымасцямі не страчвалі надзею на паўнавартаснае жыццё. Цудоўна, што выхаванцы дапамагаюць адзін аднаму ў якасці валанцёраў, а таксама састарэлым людзям, якія жывуць у іншай сацыяльнай установе, — падзяліўся прыемнымі ўражаннямі **Ханс-Ёрген ВАЛЬХЕД, каардынатар беларуска-шведскага праекта «Сацыяльная інтэграцыя дзяцей і моладзі з абмежаванымі магчымасцямі ў Віцебскай вобласці».**

Радуе тое, што Віцебшчына не адстае ад лепшых дасягненняў у гэтым кірунку той жа Швецыі. Пацвярджэннем таму з'яўляецца вопыт Багушэўскага дома-інтэрната і шэрагу тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*Сенненскі раён.*

**Фота аўтара.**




■ Знаходка

## Што шукалі каля ўсыпальніцы князёў?..

**Каля ўсыпальніцы князёў Паскевічаў у Гомелі калісьці знаходзіўся старажытны вакольны горад. Такую выснову зрабілі спецыялісты пасля правядзення археалагічных раскопак на тэрыторыі вобласці і, у прыватнасці, на некаторых участках Гомельскага палацава-паркавага ансамбля.**

Загадчык аддзела археалогіі Аляксандр ПІСАРЭНКА і навуковы супрацоўнік Дзмітрый ЛЕДЗЯНКОЎ расказалі, што ўдалося адшукаць некалькі складнікаў сярэднявечнага горада. Па-першае, гэта ваенны цэнтр, або гарадзішча, на месцы якога пазней сталі будаваць спачатку дзядзінец, а потым замак. Археалагічныя раскопкі паказалі, што на месцы сучаснага палаца Румянцавых-Паскевічаў і сапраўды калісьці знаходзіўся сярэднявечны замак. Ён быў добра ўмацаваны земляныміваламі, драўлянымі сценамі і ровам. Па-другое, вакольны горад, які таксама меў добрую ахову на выпадак нападу ворагаў, знаходзіўся побач. Па-трэцяе, пасады, якія размяшчаліся вакол умацаванняў. Аднак яны захаваліся не так добра. Увогуле ж сенсацыйнымі гэтыя знаходкі не назавеш. Яны проста пацвердзілі тое, што археолагі ведалі ўжо раней.

Было знойдзена таксама жытло XVIII стагоддзя, а дакладней, яго ніжняя частка, якая называецца «падклет». Аляксандр Пісарэнка патлумачыў, што калі гэта быў панскі дом, то ў падклеце магла жыць чэлядзь або трымалася казна. Калі ж у доме жылі простыя людзі, то там звычайна знаходзілася складское памяшканне або майстэрня.

Найбольш цікавыя археалагічныя экспанаты, знойдзеныя на Гомельшчыне сёлета, у бліжэйшы час можна ўбачыць на выставе ў палацы Румянцавых-Паскевічаў.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

# «ВОСЬ ТАБЕ І КУЛІК, АБО З ВЯЛІКІХ БАНКЕТАЎ ГАЛОДНЫЯ ДАХАТЫ ПРЫЯЗДЖАЮЦЬ»




*«Звязда» распачынае новую рубрыку — «Байкі кухмістра Верашчакі», у якой пра гісторыю і культуру нашых продкаў — шляхты і сялян, праваслаўных і католікаў, духоўных і свецкіх людзей — будзе распавядацца праз даўнія кулінарныя і калякулінарныя байкі, легенды, анекдоты. Іх сабраў для нас вядомы даследчык беларускай старадаўняй кухні. Аднак яго імя мы пакінем у сакрэце.*

*Ежа заўжды займала і будзе займаць шмат месца ў жыцці чалавека, і не толькі ўласна спажыванне і прыгатаванне ежы, але і шматлікія сямейныя і таварыскія звычаі, рытуалы, забабоны, павер'і, кур'ёзы, якія спадарожнічаюць гатаванню і бяседзе. Памяць пра ўсё гэта — важны элемент культуры любой нацыі. Сучасныя беларусы кепска ведаюць гэты пласт культуры, і, спадзяёмся, будзе не лішнім пра яго нагадаць.*

*Нашым віртуальным гідам у мінуўшчыну будзе кухмістр Яго Вялікасці Станіслаў Верашчака. Кажуць, што кухмістр смачна і дасціпна карміў апошніх каралёў Рэчы Паспалітай, і між іншым, вынайшаў славутую цяпер страву — верашчаку, названую ў яго гонар. А ўжо колькі ён ведае розных смешных і павучальных баек і прыпавесцяў з нашай гастранамічнай гісторыі — то мусіць, не мае ў гэтым сабе роўных!*

*Куліг — кавалькада з запрэжаных саней, якія часта мелі дзіўную форму (напрыклад, у выглядзе лебядзінай галавы з выцягнутай шыяй або тулава мядзведзя), і вершнікаў з запаленымі паходнямі. Такім маляўнічым і шумным чынам даўней, у XVII — XIX стагоддзях, шляхта адзначала Божае Нараджэнне і іншыя зімовыя святы (аж да самага Папяльца, з якога пачынаўся Вялікі пост), вандруючы ад аднаго маёнтка да наступнага. І ў кожным маёнтку ладзілася неўтаймаванае баляванне з музыкай, танцамі, гульнямі, раскладзенымі проста ў двары вогнішчамі, дзе смажылі «канфіскаванае» ў гаспадароў птаства і жывёлу. Калі ў адным доме гаспадароў аб'ядалі дачыста, іх забіралі з сабой і ехалі ў наступнае месца. Так куліг паступова разрастаўся, як снежны ком, і забавы рабіліся ўсё больш гарэзлівымі і свавольнымі.*

*Дагэтуль гісторыкі спрачаюцца, адкуль паходзіць польскае слова kulig: ці то ад ад слова «кола», ці то ад «кулі» — крывой ляскі, або жазла, які перадавалі ад аднаго маёнтка да іншага, як эстафетную палачку. У любым выпадку, беларуская і літоўская шляхта часам не да канца разумела гэтае слова, як відаць з гэтай даўняй беларускай гумарэскі, дзе яго блытаюць з птушкай кулікам. А наколькі добра ўдавалася пад'есці і павесяліцца некаторым удзельнікам куліга — залежала, відаць, ад іх спрыту.*



У Літве і асабліва на Русі ў той час, калі ўжо ўсё з поля збяруць, жыта пасеюць і птушкі кулікі лятаюць над нівамі, дык мае шляхта звычай ездзіць гуртам ад двара да двара, ад хаты да хаты, цешыцца і час весела бавіць. Называюць яны гэты час кулікам, кажучы: «Паядзім куліка!».

Дык вось, аднае матулі сын паехаў сабе з сябрамі да знаёмага і, забавіўшыся там дзён колькі ў прыемных пацехах, вярнуўся да маці.

Пытаецца ў яго маці:

— Дзе ж ты, маё дзіцятка, да гэтага часу бавіўся?

Ён расказаў матулі ўсю праўду.

— А сёння дзе ты быў? — кажа маці.

Адказвае:

— Быў там і там.

— А ці еў ты?

— Сёння мой кулік няўдалы быў. Еў стравы, гатаваныя кепска па-венгерску.

Тут матуля засмяялася і сказала:

— Маё дзіцятка, растлумач мне, што такое «кепска па-венгерску»? Бо я гэтага не ведаю.

Пытаецца далей, што там былі за стравы. Аж ён апавядае:

— Першая была страва, якую людзі ядуць, а свінні не. Другая страва такая, што свінні ядуць, а людзі не. А трэцяя такая, што ні людзі, ні свінні не ядуць, а толькі сабакі.

Маці, яшчэ больш зацікавіўшыся, пытаецца:

— Маё дзіцятка, раскажы мне, што гэта за страва, якую «людзі ядуць, а свінні не»?

— Гэта быў нямецкі гарох, альбо шабельбон.

— А што за другая страва, якую «свінні ядуць, а людзі не»?

— Гэта капуста, не кіслая, не прэсная, не салёная, не вараная, а толькі распараная, без усялякага смаку, якую я, адну лыжку ўзяўшы, жаваў-жаваў, але, глынуць не могучы, пад стол выплюнуў.

— А што за трэцяя страва, якую «ні людзі, ні свінні не ядуць, а толькі сабакі»?

— От, вашэць матка дабрадзейка, у тым доме для кулікоў спяклі цэлага індыка. Але іншыя панове кулікі да таго дому прыехалі, нас апярэдзіўшы, ды таго індыка так добра аб'елі, што адны толькі косці засталіся. Мы як на тыя косці глянулі, то кожны з нас і нож, і відэлец паклаў.

Маці, чуючы такое, ледзь ад смеху не лопнула:

— То ты, маё дзіцятка, можа, есці хочаш?

— Вядома, — кажа ён, — вашэць матка дабрадзейка, я да васпані дабрадзейкі і прыехаў куліка закончыць.

— Ну, то ёсць у мяне ў шафе смажаніна, еш яе халоднаю альбо загадай зразы прыгатаваць.

— Добра, матка мая дабрадзейка. Калі ўжо няма ні куліка, ні індыка, з'ем жа я кавалак і быка.

■ Вандроўныя нататкі

# У ХРАМА — КРЫВАВЫЯ СЛЁЗЫ

**Сённяшняя царква ў Станькава — пятая па ліку з тых, што стаялі на гэтым жа самым месцы. Ужо ў 1387 годзе маецца згадка, што тут была царква, а сама мястэчка належала вялікаму князю Вітаўту. Пазней Станькавам валодалі князі Радзівілы, графы Чапскія, і яны таксама падтрымлівалі духоўнасць. Аднак давялося перажыць ліхія часіны, калі само існаванне храма ставілася пад пагрозу…**



Алег Масліеў.



Царква ў Станькаве.

Маршрутка, што ідзе з Мінска спыняецца адразу каля царквы. Для будынка, які з'яўляецца помнікам гісторыі, храм выглядае даволі новым. Адразу побач з ім — дом, на шыльдзе якога пазначана, што тут жыў Герой Савецкага Саюза Марат Казей. А насупраць уваходу ў царкву — прыгожае возера, за якім рассцілаецца вялізны парк. Здалёк відаць старажытная альтанка.

### Блукаючы па падзямеллі

Зрабіўшы некалькі фотаздымкаў, спрабую разбіць абледзянелыя калюжыны. З царквы выходзяць будаўнікі; зразумеўшы, што я карэспандэнт, прапануюць пагутарыць. Тынкоўшчыкі Ігар Кот і Міхась Кузняцоў адразу пачынаюць расказваць, што ад царквы пад возерам ідзе тунэль. І зімой яго можна ўбачыць на абледзянелым возеры, пэўна, з-за рознасці тэмператур. Кажуць, што калісьці бульдозер, які чысціў возера, упёрся ў дно каўшом і, праваліўшыся, пашкодзіў падземны ход, які часткова заліло вадой…

Да нас падыходзіць Алег Масліеў — навуковы кіраўнік рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ царквы, галоўны архітэктар Мінскай епархіі.

Ён і стаў нашым праважатым у мінулае і сучаснасць Станькава:

— У 1852 годзе графам Эмерыкам Чапскім быў закладзены новы храм. Будаваўся ён па праекце вядомага рускага архітэктара Канстанціна Тона (аўтара храма Хрыста Збаўцы, Крамлёўскага палаца ў Маскве). У Беларусі гэта адзіны храм па праекце гэтага дойліда. Былі затрачаны вялізныя сродкі — некалькі тысяч рублёў серабром. Чапскі нават атрымаў найвышэйшую ўзнагароду ад імператара за будаўніцтва гэтай царквы. Асвячаў храм уладыка Міхаіл Галубовіч. Ён вёў дзеннікі, з якіх сёння можна шмат што даведацца з гісторыі гэтага збудавання. Там можна, напрыклад, прачытаць, што падчас асвячэння «іх светласці» ў храме не было, што нават засмуціла святара: маўляў, разам з графам будавалі, а на асвячэнне той не прыйшоў. Аднак нечакана падчас службы быццам з-пад зямлі вырас граф са сваёй жонкай Лізаветай. Пасля асвячэння Галубовіч падышоў да Чапскіх і спытаў, як ім удалося трапіць у храм, калі нават дзверы не адчыняліся? На гэта Эмерык усміхнуўся і адвёў яго ў пакойчык, у якім яны па лесвіцы спусціліся ўніз, у падземны калідор, і трапілі па ім адразу на трапезу ў палацы.

Падземны калідор захаваўся да нашага часу. Напалову затоплены, а напалову эксплуатуецца дзіцячым домам: яго выкарыстоўваюць як склад, захоўваюць там лыжы, санкі, бульбу, старую мэблю. Увогуле ж у Станькаве засталося шмат тунэляў з часоў Радзівілаў. Яны былі, як вядома, яшчэ тымі «кратамі», кажа Масліеў, і перакапалі ўсю Беларусь. Чапскія гэту сістэму скарысталі, і фактычна кожны новы будынак стваралі над падземным ходам — так усе збудаванні аказаліся звязанымі: скарбніца, палац, царква, іншыя будынкі, нават пад альтанку ідзе падземны ход. Захаваліся старыя фотаздымкі, на якіх відаць гэтыя калідоры.

У пазнейшыя часы гісторыя станькаўскай царквы шчыльна звязана з жыццём і дзейнасцю святой Валянціны Мінскай. Гэтая жанчына была вядомай прарочыцай, бачыла наскрозь унутраны стан чалавека. Усё жыццё правяла ў няспынных малітвах, людзі часта звярталіся да яе па дапамогу.

### Змаганне з крыжам

Спаўна зведаў храм і ліхія часіны. З 1936 года словы малітвы ў ім больш не гучалі. Падчас аднаго з зімніх набажэнстваў святара, яго жонку, чацвёра дзяцей, псаломшчыкаў, дыякана і ўсіх прыхаджан арыштавалі. Вясной 1937 года іх расстралялі (самаму малодшаму дзіцяці святара было меней за 4 гады).

У той жа час з царквы скінулі крыж.

— Прыйшлі пяцёра чэкістаў, — расказвае Алег Масліеў, — двое з іх залезлі на купал і сталі падсякаць крыж сякерай. Было добрае сонечнае надвор'е, ніводнай аблачынкі. Чэкісты працягвалі сваю працу, аднак крыж не паддаваўся, бо быў металічным, меў 300 кілаграмаў вагі і быў шчыльна заціснуты драўлянымі кружаламі. Верхавіну крыжа абвязалі вяроўкай, якую скінулі ўніз. Адначасова падсякаючы, сталі тузаць за вяроўку, чакаючы, пакуль крыж упадзе. У пэўны момант над царквой з'явілася невялічкае воблачка, аднак на гэта не звярнулі ўвагі. Прагучаў хруст, праз імгненне масіўны крыж паляцеў уніз з 25-метровай вышыні. Вяроўка, якая была прымацавана да яго, аблытала рукі чэкістаў. Яны, сарваўшыся, загінулі. Крыж прыдушыў і тых траіх, што стаялі ўнізе, бо ім не было відаць, адкуль ён ляцеў.

Аднак мясцовых людзей усхваляваў не гэты факт. Калі крыж ударыўся аб зямлю, грымнуў гром і лінуў моцны дождж — маленькае воблачка ператварылася ў вялізную навальнічную хмару. Непагадзь бушавала цэлыя суткі так, што ў суседняй вёсцы Каменка, якая ў 400 метрах ад царквы, змыла ласёў, што пасвіліся на палях.

Пасля гэтага выпадку Станькава заўсёды мінaлі дажджы. У наваколлі ліло як з вядра, а тут было суха. Сам Алег Масліеў нярэдка быў сведкам такіх з'яў. Раней маршруткі ў Станькава не хадзілі, даводзілася пехатой ісці ў Дзяржынск, і як толькі ён мінаў мост праз раку Уса, за якой пачынаўся іншы населены пункт, там лівень стаяў сцяной, а з боку Станькава ніводнай кроплі не было. Людзям, каб паліць агароды, даводзілася то з возера ваду чэрпаць, то спустошваць калодзежы.

Толькі пасля пачатку аднаўленчых работ у царкве сітуацыя змянілася. Дажджу бывае столькі, што часам нават даводзіцца прасіць, каб яго было менш, заўважае Алег Масліеў.



Іканапісец Ігар Шыкулаў і яго памочніца.



Імянная цэгла.

### Калі і сценам балюча

Лёс храма за савецкім часам складваўся нярадасна. Там сталі захоўваць збожжа, у ваенны час — зброю. Пры немцах спрабавалі аднавіць набажэнствы, аднак праз два тыдні тыя расстралялі святара за сувязь з партызанамі. Калі вайна скончылася, дах сталі разбіраць на будаўніцтва сельсавета і іншых калгасных пабудоў.

Вясной 1961-га з-за таго, што храм «псуе пейзаж», было вырашана яго ўзарваць. Мясцовыя ўзгадваюць, што з Мінска сюды прывезлі падрыўніка, які распарадзіўся на ўзроўні паўтара метра зрабіць зандажы, у іх закласці дынаміт, абвязаць дротам. Жыхароў з навакольных дамоў эвакуявалі. Людзі сабраліся на супрацьлеглым беразе возера, бо да месца выбуху іх не падпускалі — усё было ачэплена вайскоўцамі з аўтаматамі. Расказвае Масліеў:

— Апоўдні прагрымеў першы выбух. Воблака пылу ахінула храм. Калі яно разышлося, усе ўбачылі, што царква стаіць цэлая. На людзей гэта зрабіла моцнае ўражанне, многія ўбачылі ў гэтым Божую руку. Яшчэ праз паўгадзіны прагрымеў другі выбух. Зноў воблака пылу паднялося вышэй за царкву, яна падскочыла. Калі пыл асеў, аказалася, што будынак яшчэ стаіць, толькі пайшлі глыбокія расколіны па фасадзе. Яшчэ адзін выбух, праз 30–40 хвілін, змог нарэшце расхалоць метровай таўшчыні сцены. Абрынуліся скляпенні, у бок возера ўпала званіца. Увесь храм узрываць пабаяліся, бо побач стаялі жылыя дамы: раптам якая са сцен абрынецца. Тады вырашылі парасцягваць іх у розныя бакі. З мясцовай ваеннай часці прыгналі два баты (цяжкая ваенная тэхніка, якая разбурае розныя збудаванні, капае акопы, траншэі). Да іх прычапілі па пяць сталёвых тросаў і рухамі ўзад-уперад сталі перапільваць сцены. Адначасова адбойнымі малаткамі падбівалі тыя месцы, дзе хадзілі тросы. Аднак ажыццявіць задуму не ўдавалася: псаваліся рухавікі ў танках, ірваліся тросы, ламаліся малаткі — і мясцовыя жыхары паднялі такі гвалт, што гатовы былі на руках вынесці прэч гэтыя танкі. Святыню знявечылі і забыліся на яе.

Пасля тых жудасных падзей руіны царквы стаялі 45 гадоў, чырвонай плямай адлюстроўваючыся ў возеры. Да таго ж храм быў зроблены з цэглы-сырца, таму падчас дажджоў гліну вымывала, і яна чырвонымі струменямі цякла па сценах…

У 1972 годзе зноў спрабавалі разбурыць царкву, ужо з-за таго, што яна ўяўляе сабой небяспеку для мясцовых жыхароў. Да таго ж на гэтым месцы задумалі будаваць лодачную станцыю. Аднак мясцовыя жыхары сталі ў ачапленне і не далі нікому падысці да царквы. Таму яна выстаяла.

### Новае жыццё царквы

Адраджаць храм пачалі толькі ў наш час. У 1997 годзе была арганізавана праваслаўная суполка, якая пачала рабіць спробы аднавіць царкву. Аднак у той час яна ўжо стала помнікам архітэктуры: новыя тэхналогіі і матэрыялы прымяніць было немагчыма. Да таго ж руіны стаялі, як соты, да якіх невядома як было падысці. Таму работы так і не ўдалося распачаць.

